ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

# МАЛЫ
# БЕЛАРУСКІ
# СЬПЕЎНІК

ПЕРШЫ ВЫПУСК

МАСКОЎСКАЕ ГАРАДЗКОЕ ТАВАРЫСТВА
БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

1991

## ЗЬМЕСТ.

| | |
|---|---|
| Купалінка | 3 |
| Зорка Вэнэра | 4 |
| Дробна драбніца | 5 |
| Туман ярам | 6 |
| Цячэ вада ў ярок | 7 |
| Дні прыходзяць, дні адходзяць | 8 |
| Шумныя бярозы | 9 |
| Беларусь мая | 10 |
| А ў полі вярба | 11 |
| Пагоня | 12 |
| Магутны Божа | 13 |
| Гімн(Мы выйдзем шчыльнымі радамі) | 14 |
| Фронт | 16 |

Склаў Алесь Драянкоў з дапамогай
Генадзя Прыбыткі



## КУПАЛІНКА

Купалінка, Купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка, | 2 разы
А дзе твая дочка. |

Мая дочка ў садочку
Ружу, ружу поліць,
Ружу поліць, ружу поліць, | 2 разы
Белы ручкі коліць. |

Кветачкі рве, кветачкі рве,
Вяночкі зьвівае,
Вяночкі зьвівае, | 2 разы
Сьлёзкі пралівае. |

павольна, сумотна




Заувага: тут і далей дадзены толькі асноўны, спрошчаны матыў.

## РАМАНС("ЗОРКА ВЭНЭРА")

М.Багдановіч

Зорка Вэнэра ўзыйшла над зямлёю,
Сьветлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою, | 2 разы
Зорка Вэнэра ўзыйшла.

З гэтай пары я пачаў угледацца
У неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханьнем к табе разгарацца | 2 разы
З гэтай пары я пачаў.

Але разстацца нам час наступае;
Пэуна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая, | 2 разы
Але разстацца нам час.

Буду ў далёкім краю я нудзіцца
У сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца | 2 разы
Буду ў далёкам краю.

Глянь іншы раз на яе у разстаньні
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсло каханьне, | 2 разы
Глянь іншы раз на яе...

"Вянок", Вільня, 1913.






## ДРОБНА-ДРАБНІЦА...

Народная

Дробна драбніца, дробна драбніца,
Дробны дождж ідзе,
Сабралася бедна галота | 2 разы
Дый гарэлку п/е.
    П/ем мы гарэлку, п/ем мы вішнёўку,
    Будзем піць віно,
    А хто прыйдзе, з нас насьмяецца, | 2 разы
    Будзем біць таго.
Прыйшоў да хаты дзядзька багаты,
Насміхаецца.
"Ой, за што, за што бедна галота | 2 разы
Напіваецца?"
    "Ой, ты ня сьмейся, дзядзька багаты,
    Ты ня сьмейся з нас,
    Маеш, маеш сто рублёў грошаў – | 2 разы
    Будзем усе гуляць".
"Рад бы я выпіць, рад бы я з/есьці,
Рад бы пагуляць,
Ёсьць у мяне сто рубляў грошаў, | 2 разы
Шкода разьмяняць".
    Адзін за рукі, другі за ногі,
    Трэйці ў карак б/е...
    "Ой, ня йдзі, ня йдзі, дзядзька багаты,
    Дзе галота п/е".

## ТУМАН ЯРАМ

Народная

Кожныя два радкі паўтараць па два разы.

Туман ярам,
Туман даліною.

За туманам
Нічога ня відна.

Толькі відна
Дуба зеляного.

Пад тым дубам
Крыніца стаяла.

З тэй крыніцы
Дзеўка воду брала.

Ды ўпусьціла
Залаты пярсьцёнак.

"А хто ж гэты
Пярсьцёнак дастане,

Той са мною
Пад ручнічак стане".

Адазваўся
Казак маладзенькі:

А я ж гэты
Пярсьцянёк дастану,

Я з табою
Пад ручнічак устану".

"Лепей буду
Ночку каратаці,

Чым зь нялюбым
Пад ручнічак ўстаці,

Лепей буду
У моры пясок есьці,

Чым зь нялюбым
На пасаду сесьці".





## ЦЯЧЭ ВАДА У ЯРОК

Народная

Цячэ вада ў ярок, цячэ вада ў ярок,
Кладачку занясла.
Кладачка тонелька, вада халадзенька, | 2 разы
А я маладзенька.

Іванька ня прыйшоў, Іванька ня прыйшоў,
Я да яго пайду.
Вадзіцы з крыніцы, вадзіцы з крыніцы | 2 разы
Я яму аднясу.

"Вады піць ня буду, вады піць ня буду,
Вада халодная.
Люблю Марусю я, люблю Марусю я, | 2 разы
Маруся любая".



А♥



## ДНІ ПРЫХОДЗЯЦЬ...

Сяргей Новік-Пяюн

Дні прыходзяць, дні адыходзяць, дні лятуць,
Быццам рэк бурлівых хвалі ўдаль плывуць.
Шмат гадоў тут на выгнаньні ў чужыне
Трэба мучыцца душой і сэрцам мне.

Навакол нідзе не угледзіш родных хат,
Не працягне рук зычліва родны брат,
Не падзеліш нават думак з нікім тут,
Не прыгорне ў адзіноцтве родны кут.

У ноччы зорачкі прыветліва мігцяць,
Быццам з неба на мяне яны глядзяць.
Што чуваць, скажыце, зорачкі, вы мне,
У маёй роднай і далёкай старане?

І татулька мой і матынька ўжо спяць,
І на іх таксама зорачкі глядзяць.
Мо яны пытаюць зорак аба мне,
Што раблю цяпер ў далёкай чужыне.

Калі толькі яны, родныя, ня сьпяць,
Калі шчэй цяпэр на зорачкі глядзяць,
Занясеце ім, пакуль не блызнуў сьвет,
Зоркі мілыя, сыноцкі мой прывет.

Так скажыце, каб ня плакаў нівадзін,
Што ў выгнаньні, мусіць, мучыцца іх сын,
Лёс, магутны лёс пашле нам ясны май,
Прылячу тады, як птушка, ў родны край.

З новай верай, з новай сілай зажывём,
Беларускі гімн свой родны запяём.
Гэты гімн, як гром, памчыцца ў аблакі,
Усе пазнаюць, што ўжо вольны бядакі!






## ШУМНЫЯ БЯРОЗЫ

Народная

Шымныя бярозы пабяліў мароз.
Хацеў бы я плакаць, ды ня маю сьлёз.
Хацеў бы я юці аб сваёй бядзе | 2 разы
Ды мне сэрца ные, песенька не йдзе. |

Хацеў я каб воля гуляла са мной,
Каб сонейка грэла, як грэе вясной.
Толькі, Божа мілы, волі ня відаць. | 2 разы
Кайданы няволі на руках зьвяняць. |

Гэй, пайду я ў поле волечкі шукаць
З востраю касою, як на сенажаць.
Гэй, пайду я ў поле, як бы на вайну, | 2 разы
Шукаючы волі, шаблячкай махну. |

## БЕЛАРУСЬ МАЯ

Сяржук Сокалаў-Воюш

Аксамітны летні вечар ахінуў зямлю.
Я вазёрную сінечу вуснамі лаўлю.
Моўчкі слухаю у росах песьні салаўя... | 2 раз
Над маім лунае лёсам Беларусь мая. |

А над лесам, над сусьветам выпрастаў крыло
Залацісты човен-ветах, зорнае вясло.
Стан дзявочы Белавежы, подых ручая... | 2 разы
Я адной табе належу, Беларусь мая. |

Там, дзе гойдае вятрыска залаты мурог,
Паўставалі каянісці ля тваіх дарог.
Чырванее раньні золак, рэха у гаях... | 2 р
А ў грудзях тваіх асколак, Беларусь мая. |

Мне краёў чужых ня трэба, як ні варажы,
Не хачу чужога неба, радасьцяў чужых,
Бо чужына сэрца джаліць, цісьне, як зьмяя... |
Бо гукае з дальніх даляў Беларусь мая. |






## А У ПОЛІ ВЯРБА

Народная

А ў полі вярба,
Пад вярбой вада.
Там хадзіла, там гуляла | 2 разы
Дзеўка малада. |

Дзеўка ад вады,
Хлапец да вады.
Пастой, пастой, дзяўчыначка, | 2 разы
Дай каню вады. |

Рада б пастаяць,
Каню вады даць,
Мае босенькія ножкі | 2 разы
Сьцюдзёна стаяць. |

Даволі павольна



## ПАГОНЯ

Максім Багдановіч

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах.
Успомню Вострую Браму Сьвятую
І ваякаў на грозных канях.
   У белай пені праносяцца коні,
   Рвуцца, ймкнуцца і цяжка хрыпяць.
   Старадаўняй Літоўскай Пагоні
   Ні разбіць, ні спыніць, ні стрымаць.
У бязмежную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?
   Мо яны, Беларусь, панясьліся
   За тваімі дзяцьмі ўздагон,
   Што забылі цябе, адракліся,
   Прадалі і аддалі ў палон?
Біцце ў сэрца іх, біцце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
За радную старонку баліць...
   Маці родная, Маці-Краіна,
   Ня ўсьцішыцца гэтакі боль!
   Ты прабач, ты прыймі свайго сына,
   За цябе яму ўмерці дазволь!
Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць.
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Ні разбіць, ні спыніць, не стрымаць!

(Сьпяваецца на матыў "Марсельезы")



## МАГУТНЫ БОЖА

Н.Арсеньнева
Муз.М.Равенскага

Магутны Божа! Уладар сусьветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых!
Над Беларусяй, ціхай і ветлай,
Рассып праменьне свае хвалы.

Дай спор у працы штодзённай, шэрай,
На лусту хлеба, на родны край,
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць – дай!

Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот!
Зрабі магутнай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу і наш народ!



## ГІМН

Макар Краўцоў

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На вольны, родны свой прастор.
Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор!

Няхай жыве магутны, сьмелы
Наш беларускі вольны дух!
Наш беларускі вольны дух!
Штандар наш бел-чырвона-белы
Пакрый сабой народны рух!

На бой за шчасьце і за волю
Народу слаўнага свайго!
Браты цярпелі мы даволі,
На бой усе да аднаго!

Імя і сілу беларуса
Няхай пачуе й бачыць той,
Хто будзе нам чыніць прымусы
І першы выкліча на бой.

Браты, да шчасьця мы падходзім,
Хай гром грыміць яшчэ мацней,
У крывавых муках мы народзім
Жыцьцё Бацькоўшчыны сваей,
Жыцьцё Бацькоўшчыны сваей!





## ФРОНТ

Сяржук Сокалаў-Воюш

Айчына, сьветлы вобраз твой –
Нязьменны наш маяк.
Хай цемра ладзіць нам канвой –
Я добра бачу, як
Працяг суседняга пляча
Жыве ў маім плячы,
І людажэрам-крумкачам
Нас не перамагчы!

**ПРЫПЕЎ:**

Фронт! Фронт! Фронт!
Ён маё і тваё абуджэньне,
Ён народу майго адраджэньне,
Фронт! Фронт! Фронт!

Там сталініст, там бюракрат –
Рабы старых ідэй.
Яны ствараюць штурматрад –
Вандэю ўсіх Вандэй.
Яны вядуць сьмяротны бой –
Ярлык, дубінка, газ –
І не валодаюць сабой,
Пачуўшы наш адказ:

**ПРЫПЕЎ.**

Я цьвёрда веру ў свой народ,
Абуджаны ад сну,
Вясны адчуўшы надыход,
Вітае ён вясну.
Якія б беды не былі,
Запомні добра ты:
Каб жыць і выжыць на зямлі,
У фронт яднайся ты!

**ПРЫПЕЎ.**